10 ДЗЁН, ЯКІЯ ЎСКАЛЫХНУЛІ СЭРЦЫ

20 чэрвеня 1990 года большасць з гэтых маладых людзей упершыню ступіла на Беларусь, на зямлю сваіх продкаў. Гэта іх, ужо нашых добрых знаёмых — беларускі танцавальны гурток „Васілёк" з Нью-Йорка з яго кіраўнічкай Алай Орса-Рамана, прывіталі беларусы на аэрадроме ў Заслаўі. Менавіта беларусы, бо сустрэліся тут усе: і Таварыства „Радзіма", якое запрасіла іх сюды на дзесяцідзённую пабыўку, і шматлікія прадстаўшкі Народнага Фронту з розных гарадоў Беларусі, ды і проста свае людзі, аб'яднаныя ў розных суполках і не аб'яднаныя ў ніякіх.

Калі ў мінулым годзе нью-йоркскі „Васілёк" прыехаў упершыню на Беласточчыну, амаль ва ўсіх іх адчуваўся лёгкі сум: во, каб далей, на Беларусь! І якраз у „Ніву" пазваніў галоўны рэдактар „Голасу Радзімы" Вацлаў Мацкевіч і спытаў пры нагодзе, ці прыехаў ужо „Васілёк". А як жа, паспяшаліся мы паведаміць, прыехаў, але найвялікшай іх марай было б пабываць у Мінску, на Беларусі. Размова была канкрэтная. „Калі хочуць? Адразу цяпер, ці іншым разам?" — спытаўся рэдактар В. Мацкевіч. Вядома, хацелі б адразу, але, на жаль, не маглі: устрымлівалі тэрміны водпускаў, многія адразу пасля паездкі ў Польшчу мусілі вяртацца на працу ў сваіх фірмах. Дый наогул, да кожнай жа паездкі трэба падрыхтавацца. А можа лепш было б, каб наогул запрасіў іх хто іншы, не таварыства „Радзіма", бо, як вядома, іх папярэднія адносіны не ўкладаліся найлепш...

Іншага спонсара, аднак, не знайшлося, а таварыства „Радзіма" слова стрымала і ўсё аформіла вельмі спраўна. 17 членаў гуртка „Васілёк" (з дарослых — толькі Ала Орса-Рамана, Вера Бартуль і Надзя Кудасава, а рэшта, хаця і маладыя людзі, дык таксама нашы знаёмыя — Аня Бартуль, Коля і Паўлік Рамана, Алеся і Юрка Кіпель, Вера Запруднік, Нансі За-

харкевіч, дарэчы, адзіная дзяўчына, якая не гаворыць па-беларуску, бо маці яе амерыканка, але сябры і так называюць яе па-свойму Надзяй, Ліда Данілюк, Галіна і Коля Бахар, Віктар Тур, Дарота і Пётр Рыжыя, ну, і вядомая ўжо нам па мінулагодніх здымках „рэпарцёрка" Паўлінка Сурвіла, яна ж і танцуе таксама) прыехалі на Беларусь на невялікі адрэзак часу, усяго на 10 дзён. Але гэтыя 10 дзён, можна смела сказаць, ускалыхнулі людскія сэрцы... І варта было б дададаць яшчэ, што іхні візіт ператварыўся ў сапраўдную маніфестацыю, у фестываль беларуска-беларускай дружбы.

Цяжка было б адным сказам акрэсліць мэту прыезду амерыканскіх беларусаў да сваіх суродзічаў. Дабрачынныя выступленні ў дар ахвярам Чарнобыля? Перадача медыкаментаў для чарнобыльскіх дзяцей ад беларускай моладзі з Амерыкі?! Знаёмства з зямлёй продкаў, з гісторыяй? А мо пазнанне сённяшняга бурлівага дня Беларусі, дзе адбываецца столькі перамен, пра якія гэта моладзь дагэтуль магла толькі чуць?..

Здаецца, было тут усяго пакрысе. Здаўна насілі яны ў сабе юнацкую мару пра далёкую, але як жа блізкую іх сэрцам блакітнавокую і недасяжную краіну бацькоў і дзядоў. І вось нарэшце гэтыя мары сталіся явай.

Стомленыя амаль паўтарасутачнай дарогай (у Маскве чакалі яшчэ Алесю Кіпель, якая прылятала з Мюнхена, куды вось ужо на два гады загналі яе адвакацкія абавязкі), паўпрытомныя, але шчаслівыя, пасля невялічкай „практыкі" даюць свой першы канцэрт ужо 22 чэрвеня ў Мінскім палацы прафсаюзаў.

„Як жа быць? — думаецца мне. — Я ж якраз буду на вяселлі ў родзічаў!" Але мушу быць на гэтым канцэрце. Роўна а 19.30 з нейкім прыстойным хлопцам вырываюся з вяселля. На сваёй машыне вязе ён на канцэрт. Не ведаю, калі канцэрт скончыцца, і таму не дамаўляюся з ім на дарогу назад.

Пасля канцэрта віншую за заслонай Алу і Веру. Віншую з першым выступленнем на Беларусі. Але як жа вярнуцца, каб яшчэ незаўважальна ўслізнуцца на вяселле? Разглядаюся

навокал. Каля палаца стаіць маса машын. Стасую вядомую ўжо мне тактыку. Бачу, чалавек у акулярах сядае ў новенькі самаход. Думаю: калі прыехаў на гэты канцэрт, то мусіць быць беларусам. А калі беларус, дык выручыць! Падыходжу і пытаю (па-беларуску, вядома), ці не падвёз бы ён мяне да рэстарана, дзе адбываецца вяселле. „З прыемнасцю", — адказвае мне ён , а я сядаю і на яго пытанне, ці я мінчанка, кажу, што я з „Нівы". „Не можа быць! — усклікае чалавек на той цудоўнай беларускай мове, якую ў Мінску зачаста не пачуеш. — А я ж ваш сталы чытач! — і прадставіўся: — Алесь Пятроўскі!" Сваёй мовай увёў мяне ў зман, бо я падумала, што гэты чалавек літаратар. Высветлілася аднак, што працуе на заводзе халадзільнікаў. Не было рады — мусіла пакінуць майму міламу выбаўцы... свой аўтограф.

Ну, а што датычыцца канцэрта, дык былі там, здаецца, усе (у сціску ўдаецца паціснуць руку В. Мацкевічу і падзякаваць за гэтую сустрэчу), а хто не прыйшоў на першы дзень, дык прыйшоў на другі. Пасля першай ластаўкі Данчыка, што восенню мінулага года прыляцела з-за акіяна на Беларусь, быў гэта другі момант, які выклікаў у гледачоў спачатку здзіўленне, што вось недзе там, „дзе ходзяць уверх нагамі", людзі памятаюць пра мову бацькоў, хаця навокал акіян ангельшчыны. Пасля было захапленне і апляўз і нарэшце пад гукі песні „Люблю наш край, старонку гэту", якую ўсе спяваюць стоячы, наступае вялікае, магутнае яднанне беларусаў. Валянціна Пархоменка са сваёй капэлай „Жывіца" ўразнастайніла спевамі канцэрт дружбы. У канцэрце ўзялі ўдзел і шасцёра нашых басаўцаў, якія дзельна дапамагалі „Васільку".

І так ужо было да канца іх выступленняў. Мелі яшчэ спяваць нашы „Дубіны", але нешта ў іх там не выйшла. Самі прыехалі, а інструменты засталіся на граніцы. А шкада, мог бы атрымацца сапраўды міжнародна-беларускі канцэрт!

У Мінску „Васілёк" аформіў шмат спраў. Моладзь жа збіралася тут не толькі танцаваць і аглядаць. Найважнейшай, бадай, іх акцыяй была перадача 400 кг лекаў для беларускіх дзетак, пацярпеўшых у выніку чарнобыльскай катастрофы, якія якраз лячыліся ў Аксакаўшчыне пад Мінскам. Чарно-

быльская ж бяда, якая павісла над Беларуссю, сталася агульнай бядой нашай нацыі. На лекі складаліся ўсім калектывам, а Юрка Кіпель, лекар-педыятр, быў адказны за іх і шмат было яму з гэтым валакіты.

Нельга ж было абмінуць і дзіцячыя садзікі, асабліва хацеў сустрэцца „Васілёк" з дзеткамі з беларускага дзіцячага садзіка, для якіх прывёз шмат падарункаў. А ў праграме быў і побыт на радзіме Купалы і Коласа. Ды і Купалле якраз падаспела, і святкаванні яго наладжваліся то ў Мінску, то ў Вязынцы, то ў Заслаўі. Не ўсе паспявалі ўсюды, але заўсёды нехта недзе быў.

У Мінску „амерыканцы" нястомна шукалі помнікаў мінулага, часцінак забытай гісторыі народа, як бы хацелі яе ўваскрэсіць. Былі аднак крыху расчараваныя, бо папярэдні этап развіцця Беларусі не кшталтавалі занадта беражлівыя адносіны да нацыянальнай мінуўшчыны. І вось мова. Мова гасцей была аўтэнтычная, як бы застылая ў сваім існаванні, такая, якую вывезлі яе іх бацькі ці бабулі. Мова ж мінчукоў выклікала ў іх здзіўленне і смутак, хаця людзі там і вельмі стараліся гаварыць правільна па-беларуску.

А найгорш, што на ўсё замала часу! Таварыства „Радзіма" хацела запоўніць усе „дзіркі" ў праграме іх побыту, а моладзь жа рвецца да маладых! Вось каб сустрэцца, заглыбіцца ў жыццё, пагаварыць, паспяваць разам. Пад'ехаў Сяржук Сокалаў-Воюш са сваёй неадлучнай гітарай і сынком Стасікам. Разам з ім Валодзя Варачаеў, які піша цікавую музыку да беларускіх патрыятычных вершаў, і іншыя, найчасцей БНФаўскія хлопцы і дзяўчаты ўсюды вітаюць з бел-чырвона-белымі сцягамі і кветкамі.

А сну штораз менш. Старэйшыя млеюць ад стомленасці, але стараюцца віду не падаваць. Здаецца, колькі ж можа чалавек вытрымаць! І выступленні з рэпетыцыямі ў Мінску, і выезд з канцэртам у калгас „Нёман", у коласаўскія мясціны, і прыём у таварыстве „Радзіма", і сустрэча ў Інстытуце мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР. А яшчэ ж у Мінску мае быць і канферэнцыя БНФ „Адраджэньне", на якой таксама неабходна было б пабываць,

і запрашае Таварыства беларускай мовы на сустрэчу (вядома ж, што яно ўжо наладзіла сувязі з амерыканскімі беларусамі, а Вера Бартуль якраз старшыня такога ж таварыства ў Нью-Йорку). А родзічы? Колькі іх перавярнулася за гэтыя дні! Толькі Вера з дачкой Аняй сустрэліся бадай з дваццаццю асобамі! Пацалункі, слёзы, кветкі. А яшчэ ж, найважнейшае, трэба заказаць касцюмы, аб якіх была мова ўжо ў мінулым годзе ў нас. Толькі аўтэнтычныя! З ручной вышыўкай і ніякія іншыя...

І вельмі хвалюе іх падарожжа ў Полацк, Вільню, Гародню.

26 чэрвеня а шостай гадзіне раніцы „Васілёк" са сваімі касцюмамі ладуецца ў аўтобус. Перад ім няблізкае падарожжа: найперш Полацк, пасля Вільня,

Мінск. Каля радыёкамітэта аўтобус падбірае „Жывіцу" з яго інструментамі, едуць таксама нашы басаўцы, прадстаўнікі таварыства „Радзіма", ды й прадстаўніка „Нівы" кіруючы групай Анатоль Абрамчык таксама прымае ў гэту кампанію. Дарога ў Полацк была б даволі манатонная, каб не лопнула калясо і на вымушаным прыпынку не давялося б скаштаваць грыбнога супу і дранікаў вырабу Валянціны Пархоменка — лідэра „Жывіцы". Нават ніхто не пераняўся тым, што здарылася. Пад'еўшы і патанцаваўшы на лясной паляне, усе паехалі далей, як толькі шафёры аўтобуса памянялі кола.

У Полацк заехалі даволі позна, а вечарам жа выступленне, няма калі аглядаць помнікі даўніны. Усё ж такі ўпрашваем нашага экскурсавода з Полацкага гісторыка-археалагічнага запаведніка, каб паказала нам сёння хаця Спаса-Ефрасіннеўскую царкву. Яна робіць гэта для „Васілька". Адкрываюць царкву і мы ўваходзім усярэдзіну. У вачах амерыканскай моладзі захапленне. Гэта ж падумаць, помнік культуры аж з XII стагоддзя! Не досыць, што ў Амерыцы наогул такіх помнікаў няма, дык яшчэ і беларускі, іх, родны. З зацікаўленнем аглядаюць яны рэшткі унікальных фрэсак. Так, працы для рэстаўратараў тут непачаты край. І грошай, неабходных дзеля гэтага, таксама не злічыць.

Едучы ў Полацк, мне вельмі хацелася пахваліцца беларускім музеем кнігадрукавання імя Францішка Скарыны, які

паўстае ў Полацку. Усё ж такі туды трапіла ўсё каштоўнейшае з бібліятэкі майго бацькі. Аднак жа экскурсавод паведамляе нам, што ствараецца такі музей, але адкрыццё будзе толькі ў пачатку верасня. Вельмі ўцешылася і я, і яна, што вось мы тут, у гэтым аўтобусе сустрэліся, і дадала з мілай усмешкай, што ў асноўным абаперліся яны на кніжкі, якія на працягу многіх гадоў былі зместам жыцця майго бацькі. Сафійскі сабор, дзе сёння месціцца гісторыка-археалагічны запаведнік удалося агледзець толькі звонку, ды і то толькі на другі дзень раніцай (ізноў выпрасіла моладзь), бо спяшаліся ў Вільню. Валік Сельвясюк крыху расказаў пра яго.

Вільня — гэты ладны кавалак беларускай гісторыі — уразіла амерыканскіх гасцей. „Ніколі не думала, што Вільня такая прыгожая", — сказала Вера Бартуль. Група людзей з бел-чырвона-белымі сцягамі хадзіла па Вільні сцежкамі Скарыны, „нашаніўцаў", Купалы, Гарэцкага, Шырмы, наведала магілу Кастуся Каліноўскага і ўпрыгожыла кветкамі табліцу былога дамініканскага манастыра, у якім сядзелі паўстанцы 1863 года, у тым ліку і Кастусь Каліноўскі (крыўду выклікаў надпіс: „Костас Калінаўскас". Божа, як лёгка людзі прысвойваюць сабе чужых герояў!). Нехта сказаў з тратуара: „Смотри, белорусы идут!".

Вадзіў гасцей па Вільні не абы-хто, а сам сын Антона Луцкевіча, Лявон. Каму ж, як не яму, і ведаць так усе беларускія сляды ў Вільні! Дапамагала яму добраахвотна заядлая, маладая беларуска з іхняга ТБК Людміла Кардзіс. Аж з Эстоніі на сустрэчу прыехаў Уладзімір Дзехцярук, старшыня Кохтла-Ярвескага беларускага культурнага таварыства.

Для змучаных яшчэ перад выступленнем гасцей, віленскія беларусы наладзілі цудоўны банкет. На спецыяльнае жаданне Веры Б. (да якога далучыліся і іншыя) прынеслі нават пахучую капусту. Пра ўсё клапаціўся найбольш Хведар Нюнька — старшыня Таварыства беларускай культуры ў Вільні.

Пасля вячэрняга выступлення — ад'езд у Гародню. А ўсё ж такі ў Вільні гледачоў на канцэрце сабралася менш, як у іншых месцах... У Гародні раніцай адразу званю Дануце Бічэль-Загнетавай. „Ада, — перажывае яна, — уначы прыехаў

Сяржук Сокалаў з хлопцамі, а ў мяне ў хаце толькі яйкі!" Кажу, неяк пераб'ецеся і з тымі яйкамі, а ў думках удзячная сваякам з Мінска, якія ўсунулі мне на дарогу ладны кавалак вясковай шынкі, мінскага хлеба і агуркоў...

І факт, усё прыдалося ўначы, калі пасля выступленняў (з нязвыклым уздымам у Палацы юнацтва) і вячэры ў гатэльным рэстаране Сяржук з Валодзем павезлі нас да Дануты. Нас, гэта значыць Веру і Аню Бартуль, пару хлопцаў-басаўцаў, бэнээфаўку Тоню Емяльянаву, ну, і мяне. Недзе ў халадзільніку наша славутая паэтка знайшла яшчэ кавалак мяса, якое падсмажыла на радасць нам усім, ды нават паспела зварыць бульбу. Вера і хлопцы паклапаціліся пра слушнае піво. Сяржук з Валодзем умілялі нам вечар сваімі патрыятычнымі спевамі. Цяжка было мне прабіцца з чытаннем уголас Данусіных і Караткевічавых вершаў... На развітанне Данута падпісвае мне і Веры сваю апошнюю кніжку „А на Палессі". Вяртаемся ў гатэль а пятай раніцы.

Яшчэ па дарозе назад у Мінск „Васілёк" заскаквае ў нядаўна адкрыты музей Ф. Багушэвіча ў Кушлянах... Гэта ж усё сваё, беларускае.

Дзесяць дзён — час невялікі. Але ўбачыць „Васільку" на Беларусі давялося нямала. Наведалі зямлю сваіх продкаў, зямлю старую як свет і шматпакутную. Былі і ў Курапатах, і ў Хатыні, а ў майстэрні мастака Міхася Савіцкага ўбачылі на яго палотнах, як жывую, сённяшнюю „Чорную быль". Здавалася б, чаго гэтым людзям трэба? Гэта ж людзі стабільныя ў жыцці, адны з іх даўно прыжыліся ў Амерыцы, а другія, тая большасць якраз, ужо і нарадзіліся там. Маюць цікавыя прафесіі, сваё асяроддзе. Навошта ім тыя танцы і песні? Навошта шукаць на старой зямлі свае карані? Ды й наогул, што ім дае тое імкненне да беларускасці?

А я думаю так, што гэтая беларускасць — папараць-кветка, а шуканне яе дае ім шчасце і стымул да жыцця. Пра гэту іхнюю папараць-кветку, магчыма, удасца мне расказаць болш, калі бліжэй пазнаёмлюся з іх штодзённым жыццём у Амерыцы.

„Ніва" н-р 34, 35 (1789, 1790) ад 26 жніўня і 3 верасня 1989 г.